ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ
ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 78 (460) Чацьвер 14 ліпеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У АЎТОРАК, ЧАЦЬВЕР І СУБОТУ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комсам. 25.

Экзамін вытрымалі.

Уся мірная работа праходзіць у абставінах становячайся ўсё больш і больш рэальнай небясьпекі вайны супроць Савецкага Саюзу з боку імпэрыялістых.

Гэтай растучай небясьпецы вайны працоўныя ўсяго Савецкага Саюзу супроцьстаўляюць узмацненьне абароназдольнасьці СССР.

І комсамол Беларусі, зараз, заняўшыся гаспадарчай, культурнай работай, добра памятуе і ажыцьцяўляе лёзунг: **«хочаш міра, рыхтуйся к вайне"**,

Іменна таму, што рабочай і сялянскай моладзі Беларусі дорагі заваёвы сацыялістычнай рэвалюцыі, іменна таму, што нам дораг кожны дзень мірнай будаўнічай працы,—іменна таму комсамол ваенізіруя свае шэрагі, рыхтуецца к вайне, жадаючы адначасова міру. Паказам такой работы былі **Бабруйскія комсамольскія манэўры-збор.**

18-га чэрвеня на сваім пасяджэньні Бюро ЦК ЛКСМБ дазволіла Бабруйскаму АК ЛКСМБ правесьці комсамольскія манэўры-збор, з прывурочваньнем да гэтага збору **конкурсу** на ячэйку, якая пакажа лепшы прыклад дысцыплініраванасьці, загартаванасьці, арыентыроўкі ў вайсковай вучобе. Збор павінен быў паслужыць праверкай вайсковай падрыхтоўкі комсамольцаў, пабудзіць моладзь зацікавіцца вайсковай справай.

Збор адбыўся 9, 10 і 11 ліпеня. Да збору рыхтаваліся ўсе ячэйкі Бабруйскай гарадзкой і раённай організацыі. Працавалі вайсковыя гурткі, праводзіліся страявыя заняткі, вывучалася стралковая справа. Разам з гэтым вялася работа па растлумачэньню задач т-ва Т. С. А.-Авіахім, вярбоўка ў іх беспартыйнай рабочай і сялянскай моладзі і дарослых.

Кіравалі заняткамі—прапшоўшы дапрызпадрыхтоўку комсамолец, кіраўнік саўхозу, ведаючыя добра вайсковую справу, старшыня рабачкому, які знаходзіўся ў складзе камскладу і г. д.

Стралковай справе вучыліся на вінтоўцы, пазычанай у райміліцыі (яч. в. Восава) на бярданцы (яч. саўхозу «комуна»), а большасьць ячэек—толькі тэорэтычна, па купленаму статуту.

І ўсё-ж, ня гледзячы на гэтыя цяжкасьці, самы збор паказаў вялікія дасягненьні. Па словах камандзіраў, кіраваўшых зборам, манэўры пакінулі самае добрае ўражаньне.

— Сабраць адразу пасьля кароткага часу падрыхтоўкі сваімі сіламі тысячы моладзі, організаваць яе і кінуць у вайсковую опэрацыю,—для гэтага трэба было мець людзей, аддданых справе.

Амаль 100 проц. яўка на збор, бадзёрасьць, якая не пакідала комсамольцаў увесь час збору, ня гледзячы на тое, што некаторыя ячэйкі прашлі да начнога паходу ўжо 30-50 вёрст, дысцыпліна,—усё гэта сьведчыць аб **вялізнай энэргіі моладзі рыхтавацца да абароны Савецкага саюзу.**

Збор быў дэмонстрацыяй дасягненьняў комсамольскай моладзі да тыдню абароны, дэмонстрацыяй да дню вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, дэмонстрацыяй гатоўнасьці бараніць Савецкую Беларусь у любы момант.

Вядома, работы па збору мелі і свае недахопы. Прычынамі іх былі кароткі час падрыхтоўкі, адсутнасьць добрых кіраўнікоў, вінтовак, але збор паказаў, што пры жаданьні можна зрабіць вельмі многа, організаваць заняткі, знайсьці кіраўніка, вінтоўку і г. д.

Бабруйская гарадзкая і раённая організацыі—экзамін баявой падрыхтоўкі **вытрымалі.**

— Яны маюць багаты вопыт у справе ваенізацыі, які другім організацыям **неабходна скарыстаць.**

Бабруйская організацыя змагла 9,10 і 11 ліпеня дэмонстраваць **вялікія дасягненьні ў справе ваенізацыі** толькі дзякуючы энэргічнай рабоце організацыі кожнай ячэйкі, райкомаў і Акруговага Камітэту.

Лёс беларускай белай эміграцыі

Артыкул Заг. ГІСТПАРТУ ЦК КП(б)Б тав. Сянкевіча

Комуністычная партыя, якая вяла ў бой пролетарскія кадры ў дні Кастрычніка, разам з заваёвамі апошняга правяла ў жыцьцё і свой лёзунг нацыянальнай політыкі. **Кожная нацыя атрымала права на самавызначэньне аж да поўнага аддзяленьня.**

Буржуазія раней прыгнечаных нацый пры дапамозе імперыялістычных дзяржаў скарыстоўвала гэты лёзунг **у сваіх мэтах** і, вядома, **супроць пролетарскай дыктатуры.** Беларуская дробна-буржуазная інтэлегенцыя пашла тым-жа шляхам. Захапіўшы ў свае рукі Ўсебеларускі конгрэс і выдзеленую ім раду, яна супроць ставіла іх ужо існуючай у нас уладзе Саветаў. Яна нават біла наклоны нямецкаму Вільгельму і дзякавала яму за вызваленьне ад бальшавіцкай навалы. У часы окупацыі ўтвараліся опэрэтачныя ўрады так званае БНР (Беларускай Народнай Рады). Фактычна ніякай улады яны ня мелі — ім гэтага не дазваляў ні Вільгельм, ні пан Пілсудзкі.

Чырвоная армія вымела іх за кардон разам з Пілсудзкімі і Вільгельмамі. Але, апынуўшыся за межамі, гэтыя «ўрады» без тэрыторыі і народу працягвалі лічыць сябе сапраўднымі прадстаўнікамі зямлі беларускай. Яны абівалі парогі і Лігі Нацый і міністэрстваў замежных спраў вялікіх і малых дзяржаў, якшаліся з рознай белагвардзейскай эс-эра-меншавіцкай зграяй і ўсё чакалі тае хвіліны, калі беларускі народ, які «стогне» пад ярмом бальшавікоў, пакліча іх кіраваць сабою.

Але йшоў час, і гэты народ ня толькі ня клікаў, але слаў праклёны ўсім тым, хто здрадзіў інтарэсам працоўных. БССР у саюзе з другімі братнімі рэспублікамі расла і ўзмацнялася. **Шпаркім тэмпам аднаўлялася краіна як па лініі экономічнай, так па лініі культурнай.**

Ужо польская окупацыя адчыніла вочы нават і падсьлепаватым, а тое становішча, у якім апынулася Заходняя Беларусь—курс «дэмократычнай» Польшчы **на поўнае зьнішчэньне беларускай нацыі,** выцьверазіла ўсіх тых, хто яшчэ хістаўся.

Не за страх, а за совесьць пачынае працаваць тая частка беларускай інтэлегенцыі, якая засталася ў межах БССР. Самаліквідуецца партыя беларускіх эсэраў як на тэрыторыі БССР, так і тая частка, якая працавала ў Заходняй Беларусі. У шэрагах беларускай эміграцыі ідзе барацьба, сярод пераважнай часткі яе мы назіраем «смену вех». Спачатку самаліквідуецца ўрад БНР на чале з А. Цьвікевічам. У апошнія часы складвае «ўрадавае» аружжа Ў. Ластоўскі. **Усе яны ворочаюцца на бацькаўшчыну—у краіну Саветаў,** каб тут разам з рабочымі і сялянамі будаваць гаспадарку і культуру.

Пролетарыят і працоўныя Савецкай Беларусі не адхілілі іх жаданьня вярнуцца ў Рэспубліку Працы.

Усё сумленнае, жывое сярод беларускай эміграцыі **адкінула** ідэю змаганьня з Саветамі за «незалежнасьць». Нашы перамогі, наша праца па адбудове экономікі і культуры Беларусі, зьявілася найлепшым аргумэнтам, каб перакапаць іх у абмылковасьці сваіх думак і дзеяньняў.

Хто-ж яшчэ астаўся сярод эміграцыі? Хто яшчэ думае аб зьнішчэньні дыктатуры пролетарыяту?

— Засталіся тыя, каму ніколі ня будзе месца ў сям'і працоўных; засталіся чорныя з ксяндзом Станкевічам на чале; засталіся тыя, хто зьяўляецца костка ад косткі кулакоў і вясковых багацееў, як Ярэміч і Рагуля; засталіся, урэшце, тыя «беларусы», якія **за трыццаць злотых і кілішак гарэлкі** будуць служыць сёньня Пілсудзкаму, а заўтра—каралю Эдуарду. Засталіся, адным словам, політычныя прахвосты і проституткі. Яны зьяўляюцца нашымі клясавымі ворагамі.

Гэта добра разумее беларускі рабочы і селянін там, за кардонам. Ад гэтых незваных «дабрадзеяў» ён **адварочваецца** як ад гадаў; ён чакае таго часу, калі магчыма будзе вырэзаць з коранем сьмярдзючыя чырэі з беларускага цела.

З тэй-жа інтэлегенцыей, якая прышла да нас, мы будзем дружна, разам з намі будаваць **Асінастрой, асушаць балоты, будаваць заводы, будаваць Беларускую Акадэмію Навук, вышэйшыя і нісшыя школы, беларускую літаратуру. Пэрспэктывы досыць шырокія, досыць магутныя, каб захапіць усіх пафасам творчасьці, каб адчуваць радасьць пролетарскага рытму жыцьця і яго мэтаімкненьні да ажыцьцяўленьня найвялікшага ідэалу чалавецтва—комунізму.**

Што гаворыць Чэмбэрлен

Пытаньне аб СССР у ангельскай палаце вобшчын

Агульныя спрэчкі па ўнутраным становішчы ў палаце вобшчын распачаліся выступленьнем **Понсонбі** (ранейшы т. міністра замежных спраў ва ўрадзе Макданальда), які падаў прапанову аб зьмяншэньні каштарысу міністэрства замежных спраў на 100 фунт. стэрлінгаў.

Перайшоўшы да пытаньня аб СССР, Понсонбі заявіў:

«Прыхільнікі ўраду не ўяўляюць сабе выразна, як адбіўся ў Эўропе наш разрыў з савецкім урадам прадыктаваны разуменьнямі ўнутранай і партыйнай палітыкі.

Расійцы маюць некаторыя падставы непакоіцца, бо яны не забылі, як абыходзіліся з імі з 1918 году да 1921 г. Ініцыятыва разрыву належыла Англіі.

Чужаземны друк гаворыць аб махінацыях, якія мы ўжываем, каб абкружыць СССР».

Адказваючы Понсонбі **Чэмбэрлен** сказаў: «Ніводзін з эўропэйскіх урадаў ня верыць у тое, нібыта Англія спрабуе стварыць блёк проці СССР». Далей Чэмбэрлен прасіў палату не западозраваць ні ў чым спатканьне між дзяржаўнымі дзеячамі і паўтарыў, што **ўрад абавязуецца ня зьвязваць сябе бяз адобраньня парляманту абавязацельствамі, якія ў выпадку вайны прымусілі-б Англію да крайніх дзеяньняў.**

Што ён робіць?

«Известия» ад 12 ліпеня зьмяшчаюць такую тэлеграму ўласнага корэспондэнту з Берліну ад 9-га ліпеня:

Згодна атрыманых тут пэўных вестак прыехаўшы ў Коўно 30-га чэрвеня ангельскі маёр Нэсбіт зьяўляецца палкоўнікам брытанскай разьведкі. Ён мае даручэньне аб'ехаць усе дзяржавы Прыбалтыкі і Польшчу з мэтаю выявіць баяздольнасьць іх армій і магчымасьць актыўна дапамагчы Англіі ў выпадку будучай вайны Англіі з СССР. Разам з Нэсбітам едзе ангельскі маёр Лейд. У Коўні Нэсбіт наведаўся да Вальдэмараса і начальніка генэральнага штабу Даўкантоса, а таксама знаёміўся са становішчам ковенскага гарнізону і асабліва авіяцыі. Нэсбіт абмяркоўваў, між іншым, магчымасьць дастаўкі Літве ангельскай артылерыі і амуніцыі, а таксама пытаньня аб заснаваньні аўгабазы для ангельскага паветранага флёту».

Дурацъ адзін аднаго.

Польскі афіцыёз аб польска-савецкіх дачыненьнях

Афіцыёзная «Эпока» піша: «Савецкі друк высунуў тры палажэньні: 1) Польшча падтрымлівае процісавецкія організацыі; 2) Польшча зьяўляецца зброяй ангельскай процісавецкай палітыкі; 3) Польшча не праводзіць шчыра мірнай палітыкі. Кожны ведае, аднак, што Польшча не зацікаўлена організоўваць на сваёй тэрыторыі тэрарыстычныя змовы. Чаму ў гэтым не абвінавачваецца Нямеччына, якая таксама мае манархічныя організацыі? Што датычыцца другога абвінавачаньня, дык наўрад, каб мы ўсе думалі, што 30-мільённая польская дзяржава ня мае ўласнай палітыкі і зьяўляецца толькі зброяй у нечых руках, няхай сабе нават прыяцельскіх. Довады савецкага друку шкодзяць дабрасуседзкім дачыненьням Польшчы і СССР. Польшча ня мае ніякіх падстаў дзейнічаць проці СССР.

„Фабрыкант" фальшывак прыгаворан да расстрэлу.

8-га ліпеня ў ваеннай калегіі вышэйшага суда СССР началося слуханьне справы вядомага «фабрыканта» фальшывых «савецкіх дакумантаў», арыштаванага ў чэрвені месяцы мінулага году на тэрыторыі СССР—Дружэлоўскага.

Дружэлоўскі—былы афіцэр царскай арміі. У 1928 годзе ён быў мабілізаваны ў Чырвоную армію, але ў маі 1919 г. дэзэртыраваў і ўцёк за мяжу.

Дружылоўскі абвінавачваецца ў тым, што ён быў на службе ў другім аддзеле польскага генэральнаўа штабу, і ўдзельнічаў у шпіёнскай рабоце супроць СССР і што па заданьнях агэнтаў разьведвачых ворганаў чужаземных дзяржаў, складаў для іх падложныя дакуманты, якія быццам выходзілі ад Савецкага ўраду і Комінтэрну.

Усе гэтыя абвінавачваньні Дружылоўскі прызнаў правільнымі і сябе—вінаватым. Да гэтага ён яшчэ дадаў, што ў прыгатаваньні фальшывак ён быў толькі тэхнічным выканаўцам. А сапраўднымі складацелямі былі прадстаўнікі **буржуазных краін, якія вядуць організаваную антысавецкую кампанію на чале з Англіяй.**

12-га ліпеня г. г. пасьля дасканалага разгляду справы, суд вынес прыгавор. Дружылоўскі прызнаны вінаватым і прыгаворан да расстрэлу з конфіскацыяй належачай яму маемасьці.

Прыгавор канчатковы і абскарджваньню не падлягае.

Бельгія павялічвае сваю армію

Абараняючы ў бельгійскім сэнаце ваенны бюджэт, дэ-Броквіль заявіў: „Становішча Бельгіі прымушае яе падрыхтаваць для абароны краіны армію, пропорцыянальна больш моцную, чым француская. Колькасьць войск, якія Бельгія на выпадак вайны можа выставіць у першую чаргу, неабходна давесьці да 230 тысяч чалавек.

Бліжэйшая задача ўраду заключаецца ў рэорганізацыі арміі і ўмацаваньні меж».

Юзік з пятага году.

Мы ехалі з ім са станцыі ў сваю вёску.

Спадарожнік мой Юзік, малады хлапец, седзячы са мною, пакручваў пугаю і хуценька гаварыў,--дзяліўся сваімі навінамі.

-- Восеньню ў армію пайду.

-- А можа па вазе, ці па росту не падыйдзеш? Юзік ростам быў надта не вялік і не ўяўляў сабою рослага салдата. Гэта і крыўдзіла Юзіка...

-- Глупства, па росту так—гэтак прайду, хіба ўжо да вагі прычэпяцца. Вясною на вучпункт хадзіў, скончыў на «адлічна». А гэта што-небудзь, да значыць. Выдалі паперку, а там «адлічна» стаіць, вядома, я нідзе не хуліганіў, на заняткі не пазьніўся, па стральбе амаль першы быў. Дый наогул наш сельсавет нос падцірае іншым. Мы ўперадзе былі. Куды там лазавіком з глухіх куткоў! Другі вучыцца,-вучыцца, ходзіць,-ходзіць, а на рэшце, застаецца на другі год і ні ў зуб нічога ня ведае. Быў у нас адзін, Кашкан, пацеха была! Тлумачылі яму вінтоўку цэлы месяц, а ён так пад канец і не навучыўся адрозьніваць мушкі ад затвору.

Мы абое засьмяяліся.

Я пачаў думаць аб хатнім становішчы Юзіка.

У яго старая маці і большая сястра. На зямлі ён самы працаўнік.

— А як з гаспадаркаю будзе? Куды маці дзенеш?

— Гаспадарку будзе сястра весьці, а маці хаты пільнаваць,—вось і ўся загадка.

Восень прыдзе, пяты год—сюды даеш, забяруць, і я іду

З слоў было відаць, што Юзік, надта хацеў пайсьці ў «салдаты», што ён чакае восені, як чакаюць касцы Пятра, каб выйсьці з бліскучымі косамі на сенажаць, рэзануць траву, і што Юзіка абражае думка, калі яго назавуць «малым».

Засталося два месяцы да прызыву.

Гэтыя месяцы будуць месяцамі чаканьня для Юзіка. Аб тэй пары, калі «дахтары» будуць слухаць яго і аглядаць, выносіць прыгавар над яго здароўем, ён думае ідучы за плугам, возячы гной на поле і ўжо вечарам, калі прыляжа ён на купіну на начлезе, да яго зьлятае думка аб скорым яго перараджэньні ў салдата Чырвонай арміі.

Вось невядома толькі, ці возьмуць Юзіка?

Макс.

На балотах заквітнеюць нівы

Кожны асушаны комсамольцамі вучастак, кожнае новае мэліорацыйнае таварыства ёсьць узмацненьне гаспадарчай моцы краіны.

Ен выратуе 70 тысяч

(Найда-Белеўскі канал, Мазырская акруга)

Сонца кідала свае апошнія праменьні, калі мы вылезьлі з балотнай гразі на бугарок, што з ўсіх бакоў абкружан лесам і балотнай тваньню.



Найда-Белеўскі канал да рамонту.

Тут сядзелі за сталамі на адчыненым паветры, сотні рабочых, вячэралі, ажыўлена вялі гутаркі паміж сабою.

Прыслухаўшыся да гэтай гутаркі, лёгка пераканацца, што тут і беларусы і ўкраінцы, дарослыя і маладыя, кваліфікаваныя і сэзоньнікі.

Побач прыгнуўшыся да зямлі, стаяць сівыя баракі. Іх тры... у 8 гадзін раніцы рабочыя зноў вывалілі на зарослыя берагі каналу і пачалі сваімі вілкамі і лапатамі наводзіць там парадкі. Глядзіш у адзін бок і бачыш роўненькую струю вады, якая шпарка цячэ ўніз. **Гэта ачышчаная частка каналу.**

Глянеш у другі бок, туды, дзе старанна працуюць рабочыя, убачыш хмуры малюнак. Там канал яшчэ не адрамантаваны. І вельмі хочацца тады каб і гэта частка забруілася балотнай вадой.

Рабочыя працуюць бадзёра. Крок за крокам з кожнай хвілінай усё больш і больш заваёўваюць яны астаўшуюся частку каналу.

Канал удаўжкі цягнецца на 53 вярсты і ахапляе сабою плошчу ў 50 тысяч дзесяцін, галоўным чынам, сялянскіх земляў.

Прышоў ён у нягоднасьць у 1914 г. і так зарастаў да 1924 году. З гэтага году вядзецца капітальны рамонт. Ужо адбудавана 38 вёрст. У будучым годзе ён будзе закончан.

Найда-Белеўскі канал зьявіцца цэнтральнай магістральлю вялізарнай плошчы забалочаных земляў. Сяляне, што жывуць у гэтым раёне на хутарох—выспах, якія акружаны вадою, будуць мець магчымасьць правесьці вадаправодныя стрэлкі для канчатковай асушкі сваіх вучасткаў.

Дзяржаўнымі сродкамі намячаецца пакуль што асушыць 7 тысяч дзесяцін балота.

А. Ф.



Найда-Белеўскі канал у часе рамонту

Глушынцы на сваёй гаспадарцы

(Бабруйская акруга)

Пытаньне паляпшаньня сельскай гаспадаркі пачынае займаць усе большае і большае месца ў рабоце Глускай раённай організацыі.

— **Ячэйка Латыскай калёніі заклала 3 вопытных вучасткі.** Комсамолец гэтай-жа ячэйкі **тав. Жулега перавёў сваю гаспадарку на шматпольны севазварот.**

— У яч. **Катка** 2 комсамольцы на пасёлку па заданьням ячэйкі **сеюць канюшыну, лубін, віку,** а зараз, і **ўвесь пасёлак пераходзіць на шматпольны севазварот.**

— Усе комсамольцы яч. **Косарычы** сеюць **лубін** і ён мае вялікую славутасьць ва ўсіх суседніх вёсках.

—Члены яч. **„Акцябр“** усе **ачышчалі насеньне** большая частка **пратраўлівалі формалінам;** закладзена **4 вопытных вучасткі.**

— Комсамольцы Каткаўскай і Касарыцкай ячэек **прывозілі машыны,** якімі ачышчала насеньне ўся вёска.

Асаблівай увагі заслугоўвае работа ячэйкі яўрэйскай сельска-гаспадарчай арцелі **Беразоўка.** Арцель усе мінулыя гады большасьць работы выконвала наёмнымі рабочымі. Комсамольцы дабіліся зьнішчэньня найму рабочых і цяпер працуюць самі сябры арцелі з іх сем'ямі. Перад сяўбавой кампаніяй праўленьне арцелі не хацела ачышчаць насеньня. Комсамольцы настаялі **і ачысьцілі 100 пудоў аўса.** Цяпер хлапцы хочуць узяць **на кантрольнае карменьне для вопыту 1-2 каровы.** Усе сябры арцелі аб комсамольцах арцелі адгукваюцца вельмі добра.

Недахопы ў справе **барацьбы за новую вёску** таксама ёсьць, з іх галоўны—**надзвычайна слабы ўдзел організацыі ў рабоце коопэрацыі,** так напрыклад:

— Латкалёнія організавала ў сябе **кантрольнае таварыства па паляпшэньню жывёлаводзтва,** а ячэйка ў гэтым нічога **не зрабіла.**

— У вёсцы Катка ёсьць **вялікае балота, якое не дае аніякай карысьці.** Ячэйка ня прыняла **ніякіх мер** да таго, каб організаваць асушку гэтага балота.

Прашоўшая нядаўна раённая конфэрэнцыя Комсамолу са ўсёй сур'ёзнасьцю падышла да гэтага пытаньня і вызначыла шляхі, **каб выраўняць гэты фронт.**

Цяпер ячэйкі на сваіх сходах часьцей сталі абгаварваць практычныя гаспадарчыя пытаньні.

Дрэнна толькі, што конкрэтнае кіраўніцтва гаспадарчай работай ячэек і асобнымі комсамольцамі яшчэ і да гэтага часу не пастаўлена на належную вышыню. **Вопыт організацый другіх раёнаў Глуск яшчэ не скарыстаў.**

Зрокаў.

Балота не падкачае

(Ганцаўскі сельсавет, Зембінскага раёну)

У гэтым годзе мэліорацыйныя таварыствы, якія раскіданы каля ракі Цны, пачалі заводзіць культурныя вучасткі на балоце. На некаторыя з іх панасявалі аўсы з вікай, а на іншыя пасадзілі гародніну.

Вынікі першых пасеваў на балоце ў сучасны момант вельмі добрыя. Нават на полі такія расьліны **адстаюць і шмат хутчэйшыя, чымся на балоце.** Дзякуючы гэтаму, сяляне вельмі зацікаўлены ў балоце. Праца гідратэхніка зроблена, толькі засталося атрымаць грошы і пачаць капаць канавы і замест спрадвечнага моху і багны, скора будзем мець добры кавалак зямлі.

Я.

Яшчэ толькі 8 дзён

22 ліпеня канчаецца пяцітыднёвік „Чырвонай Зьмены“.

Нагонім прапушчанае.

Сказалі „А“, але не сказалі „Б“

(Аршаншчына)

У Менску пяцітыднёвік «Чырвонай Зьмены» ўжо ў распале. На сходах ячэек спэцыяльна абгаварваюцца пытаньні аб «Чырвонай Зьмене», ячэйкі выносяць пастановы аб абавязковай падпісцы ўсімі комсамольцамі на газэту, актыў выпісвае на 6 месяцаў адразу і г. д. Хутка ў Менску ня будзе ніводнага комсамольца бяз «Чырвонай Зьмены».

Здавалася-б, што і па астатніх акругах пяцітыднёвік праводзіцца ня горш.

Але... не. Вось, напрыклад, Аршанскай акругі пяцітыднёвік амаль што не крануўся.

А трэба памятаць, што Аршанская акруга яшчэ да пяцітыднёвіку была ініцыятарам у справе распаўсюджваньня «Чырвонай Зьмены». Там яшчэ раней вынесьлі пастанову аб абавязковай падпісцы на 3 месяцы акруговым і раённым актывам. Невядома толькі як была выканана гэтая пастанова.

Але сказаўшы «А», яны не знайшлі патрэбным сказаць «Б».

З гутарак з некаторымі сакратарамі вясковых ячэек выявілася, што апошнія нават ня ведаюць, пра які гэта пяцітыднёвік у іх пытаюцца.

— Першы раз, браток,—кажуць яны, чуем мы пра гэта.

— Ніводнага яшчэ паказаньня не атрымалі.

Хутка пяцітыднёвік скончыцца.

Няўжо і ў апошнія дні пяцітыднёвіку аршанцы не заварушацца так, каб у справе распаўсюджваньня сваёй комсамольскай газэты не адстаць ад другіх акруг?

Вока.

Усім выпісаць „Чырвоную Зьмену“

(Менск, яч. агульна-адукацыйных курсаў)

Стройна адно за адным сыпалі комсамольцы пытаньні дакладчыку аб «Чырвонай Зьмене»:

«Чаму рэдка выходзіць піонэраддзел, калі «Зьмена» пачне выходзіць штодзённа, ці шмат юнкораў, ці вядзецца з імі праца і г. д.

Усе гэтыя пытаньні знайшлі свой ясны і дакладны адказ.

У выступленьнях комсамольцы крылі «Чырвоную Зьмену» за дрэнны міжнародны аддзел, за тое, што толькі цяпер стаў добрым вайсковы аддзел, крылі і самі сябе, што многія крычаць «Комсамольская Праўда» лепшая за «Зьмену», але ні тую ні другую не выпісваюць. Шмат гаварылі. І ў выніку, кароценькая разалюцыя:

Усім абавязкова выпісаць «Чырвоную Зьмену» на жнівень месяц. **Выклікаем зрабіць тое-ж самае і ўсім вучэбным ячэйкам Менску і ўсёй Беларусі.**

Шур.

Упаўнаважаны не працуе

Скардзяцца камсамольцы ячэйкі ЛКСМБ Заходняй чыгункі, Менск. «Ніколі ня ўбачыш нашага ўпаўнаважанага па друку. 2 месяцы як яго абралі, а ён яшчэ ніякай працы не праводзіць, у сэнсе пашырэньня падпіскі на газэту «Чырвоную Зьмену» сярод комсамольцаў.

А ў выніку атрымалася, што выпісалі не **толькі 2 чалавекі.** А ў ячэйцы больш 40 комсамольцаў.

Зд. Ш.

На тры месяцы

(Яч. Працасьветы, Менск)

Пасьля дакладу прадстаўніка рэдакцыі «Чырвонай Зьмены», агульны сход ячэйкі Працасьветы ухваліў;

„Усім комсамольцам выпісаць газэту „Чырвоную Зьмену на 3 месяцы. Выклікаць на гэтае-ж усе ячэйкі Працасьветы Беларусі“.

Спадзяемся, што яны пойдуць па нашаму прыкладу.


С.

Пішэце аб жыцьці батрака

Чытаючы старонкі нашай любімай газэты «Чырвоная Зьмена» заўважваеш, што мала зьмяшчаецца матар'ялу аб жыцьці нашага батрацтва, і аб дасягненьнях нашага комсамолу, у галіне гэтай працы. Няўжо нашы комсамольцы гэтае працы не праводзяць, а калі праводзяць дык чаму яны ня пішуць, ня мяняюцца вопытам?

Я прапаную каб юнкоры «Чырвонай Зьмены» адгукнуліся на мой допіс—допісамі аб жыцьці батрацтва, аб працы і ўдзеле іх у нашым социялістычным будаўніцтве.

Н. Шаірна.



На крутым перавале кітайскай рэволюцыі

(З артыкулу т. Бухарына).

Рэволюцыя ў Кітаі зараз знаходзіцца на вышыні свайго самага крутога перавалу.

За гэта гавораць факты.

Згавор гэнэралаў ад Чан-Кай-Шы да Тан-Чэн-Чжы азначае, што ўсё рашаючыя ўзброеныя сілы буржуазіі згуртаваліся вакол нанкінскага ката.

Коаліцыя Чан-Кай-Шы, Фын-Юй-Сяна, Ен-Сі-Шая фактычна азначае консолідацыю гэтага лягеру. Кантонскія арміі Лі-Ці-Сіна разам з гэтай коаліцыяй і ў блёку з ёю вядуць шалёную барацьбу супроць рабочых і сялян.

Клясавая аснова і клясавая мэта гэтай коаліцыі прыгожа выяўлена ў дэклярацыі Фіна, дзе, паміж іншым, гаворыцца, што на тэрыторыі Ухана.

«Купцы, гандляры, уласьнікі прамысловых прадпрыемстваў і землеўласьнікі прыгнечваюцца рабочымі і сялянамі. Кітайскі народ (!!Н. Б.) ня хоча такога дэспатызму».

Позіцыя Ухана—ёсьць позіцыя поўнай капітуляцыі. Фактычная змова з Нанкінам відочна. З аднаго боку—зьявішча распаду, з другога—пэўны **курс на Нанкін.** Буржуазныя радзікалы і радзікальствуючыя інтэлігенты напужаны размахам аграрнага і рабочага руху, пытаньне аб якім стала рабром: альбо **быць на чале** аграрнай рэволюцыі, альбо **страціць** па сялянам. Нячутная гастрата ценна гэтай праблемы адкідае Ухан, усьлед за Фынам і К°., у лягер **контррэволюцыі. Рэволюцыйная роля Ухану скончана.**

Політычна гэта выражаецца ў энэргічнай падрыхтоўцы выключэньня комуністаў з Гаміндана.

Аднавчасна пачалася сыстэматычная атака на рабочых, сялян, комуністых па лініі ўзброенай барацьбы і рэпрэссый. Рабочая гвардыя разброена. Апошнія атрыманыя намі весткі гавораць, што ў самым Ухане камандзір 35-га корпусу выдаў загад аб удаленьні комуністых з яго корпусу.

Гэтыя факты яскрава гавораць, што **як „організуючы цэнтр рэволюцыі“ Ўхан сябе зжыў.** Для партыі рэволюцыйнага пролетарыяту пры такіх умовах абавязковы вынік: **ніводнай хвіліны нельга заставацца ва Уханскім „урадзе“.**

Гэты выхад павінен быць дэмонстратыўным іісьці разам з політычнай дэкляраціяй партыі, якая, растлумачваючы мэты компартыі пры ўваходжаньні ва ўладу, разаблачае цяперашнюю політыку Ухана.

У дэклярацыі компартыя павінна вызначыць і **свае адносіны да Гоміндану.**

Ці цягне за сабою выхад **з нацыянальнага ўраду,** таксама і **выхад з Гоміндану?**

На нашай думку, **ня цягне.** Здрадніцкія паводзіны Гоміндана ўскай вярхушкі таксама мала могуць прымусіць нас па ўсяму фронту выходзіць з організацыі Гоміндану.

Комуністыя павінны апэляраваць к гушчам Гоміндану супроць іх правадыроў. Яны павінны ўзмацніць сваю работу ў гоміндана ўскіх нізох, праводзячы сваю пляцформу, праводзячы рашучае асуджэньне «правадыроў»; яны павінны выстаўляць самыя папулярныя запатрабаваньні масаў і вакол іх згуртоўваць нізы Гоміндану; на гэтай падставе яны павінны падрыхтаваць зьезд Гоміндану. Нават, калі ЦК ГМД вынясе рэзолюцыю аб выключэньні комуністых (што будзе амаль напэўна), то трэба весьці барацьбу за свае позыцыі ў Гоміндане так, як гэта комуністыя рабілі ў «Рабочай Партыі» і як яны робяць гэта ў ангельскіх трэд-юніонах.

Заставацца ў нацыянальным урадзе нельга больш ні хвіліны, бо гэта азначала-б ўзяць на сябе адказнасьць за ўсе яго контр-рэволюцыйныя крокі.

Але заставацца ўнутры Гоміндану гэта ні ў якім разе **не азначае несьці адказнасьць за яго кіраўніцтва:** там трэба заставацца іменна дзеля таго, каб «зьнімаць з пастоў» гэтае кіраўніцтва.

Зразумела, для гэтага неабходна, каб Кіткомпартыя вяла правільную політыку. Між тым, кіраўніцтва кіткомпартыі апош ні час **упарта сабаціравала рашэньні Комінтэрну.** Факты такія: Комінтэрн сыстэматычна даваў дырэктывы аб самастойнасьці кіткомпартыі, аб неабходнасьці разьвязваньня аграрнай рэволюцыі, узбраеньні рабочых і сялян, расправе з контррэволюцыянэрамі, дэмократызацыі Гаміндану.

У дырэктывах ніаднокраць, сыстэматычна паказвалася на няміпучасьць здрады генэралаў, на неабходнасьць разгрому контррэволюцыйнага афіцэрства сялянамі —аграрнікамі, на неабходнасьць організацыі рэволюцыйных трыбуналаў для судоў над рэакцыйнымі афіцэрамі і г. д.

Ніаднокраць кваліфікуючы тармажэньне **аграрнай рэволюцыі як праступную політыку,** Комінтэрн зваў кіткомпартыю да організацыі безаглядлага **фактычнага захопу зямлі сялянамі зьнізу.**


Выключна важнае значэньне Комінтэрн прыдаваў організацыі **ваенных** адзінак з рэволюцыйных **рабочых**

Кіраўніцтва ЦК кіткомпартыі ня вытрымала «испытания огнем». Трэба адкрыта сказаць, што яно **абанкроцілася.** Політбюро ЦК Кіткомпартыі ўвесь час тармазіла разгортваньне аграрнай рэволюцыі, **супроцьстаўляючы** ўнутраным проблемам рэволюцыі ваенныя паходы на Пекін і інш.

Позіцыя Чэн-Ду-Сю з яго формулай: «Перш—Пекін, а потым... потым пабачым»; позіцыя Тан-Шп-Сяна, «які балбатаў лібэральныя фразы»; яго-ж позіцыя пры «водпуску» з ураду «для папраўленьня здароўя»; **галасаваньне ў політбюро ЦК Кіткомпартыі супроць рашэньняў Комінтэрну (26 чэрвеня) і адкіданьне гэтых рашэньняў, як „непрактычных“;** урэшце, ня толькі адсутнасьць організацыі **адпору** рэакцыі ў Ухане, але **фактычная дапамога** ёй (дабраахвотная аддача аружжа па пастанове Політбюро ЦК)—усё гэта паказвае, што **ў кіраўніцтве Кіткомпартыі маюцца і социял-демократычныя элемэнты.**

ЦК комсамолу ў гэтыя крытычныя дні, поўнасьцю далучыўся да „не практычных“ рашэньняў Комінтэрну і ў сваёй рэзолюцыі рашуча протэставаў супроць хістаньняў і віханьняў ЦК Кітайскай комуністычнай партыі, заняўшы правільную позіцыю і па пытаньню аб конфіскацыі зямлі, і па пытаньню аб узбраеньні рабочых і сялян, і па пытаньню аб дэмократызацыі Гаміндану.

Адгэтуль неабходна зрабіць вывады, які і быў зроблен Комінтэрнам: **экстраная конфэрэнцыя партыі, перавыбары ЦК, жорсткая крытыка кіраўніцтва, выкананьне дырэктыў ВККІ, рашучая барацьба, аж да выключэньня з партыі з тымі, хто думае, што партыя павінна быць на паваду ў буржуазнай вярхушкі Гоміндану.**



Бабруйскія комсамольцы ў ролі чырвоных байцоў

Мы змагаемся за мір, але будзем гатовы даць ворагу адпор!—так сказалі 2.000 комсамольцаў, трымаючы ў руках вінтоўкі

Камандны і палітычны склад збору радасна адзначае вялікую дысцыплінаванасьць і вытрыманасьць комсамольцаў

НАША СІЛА—СТАЛЬ

Спачатку комсамольскі фізкультурны пляцок быў бяз усякага парадку ўслан стройнымі кучкамі-ўзводамі з гарадзкіх і вясковых комсамольцаў. Потым узводы склалі ў большыя кучкі і атрымалі роты; з ротаў пабудавалі батальёны, а з батальёнаў—полк...

І было чым любавацца працоўным Бабруйску, што запоўнілі сабою тротуары вуліц, калі ПА ГОРАДУ ПАД ПЕСЬНІ ВЯСЁЛЫЯ ГАДЗЁРА КРОЧЫЎ ПЕРШЫ КОМСАМОЛЬСКІ СТРАЛКОВЫ ПОЛК ДА ШТАБУ 4-ай СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ЗА АРУЖЖАМ.

Адзін узвод атрымаў ужо вінтоўкі і комсамольцы старанна аглядаюць іх спраўнасьць. Другія ўзводы гараць нясьцерпамхочуць скоранька сьціснуць мазолістымі рукамі замасьленыя вінтоўкі, тыя самыя вінтоўкі, кулі з якіх у належны час будуць АДБІВАЦЬ АПЭТЫТ КАПІТАЛІСТЫХ НА МЯСНОЕ БЛЮДА З ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СЬВЕТУ.

Полк і асобны батальён узброіліся.

На фізкультурны пляцок зьвярнуліся комсамольцы ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМІ, АДВАЖНЫМІ ГЭРОЯМІ, АДДАНЫМІ САЛДАТАМІ РЭВОЛЮЦЫІ.

Дзьве адзінкі Чырвонай арміі, на якія былі падзелены ўсе комсамольцы Бабруйскай гарадзкой і вяснов.організацый—полк і асобны батальён—доўгімі роўналежнымі чарнаватым істужкамі вылучаліся на асьветленай месяцам траве.

Стаў пасярэдку іх начальнік комсамольскага збору (камандзір 4-ай стралковай дывізіі) тав. АКУЛІЧ і простымі словамі даваў наказ комсамольцам:

У ВАШЫХ РУКАХ ВІНТОЎКА. ВЫ СЁНЬНЯ ЧЫРВОНЫЯ БАЙЦЫ. У ГЭТЫЯ ТРЫ ДНІ ВЫ НЯ ТОЛЬКІ КОМСАМОЛЬЦЫ, ВЫ ЗЬЯЎЛЯЕЦЕСЯ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМІ. ПАТРАБУЮ АД ВАС БЯСПРЭЧНАГА ВЫКОНВАНЬНЯ ЗАГАДАЎ КАМАНДЗІРАЎ, ВЯЛІКАЙ КОМСАМОЛЬСКАЙ ДЫСЦЫПЛІНАВАНАСЬЦІ, ЛЕНІНСКАЙ ВЫТРЫМАНАСЬЦІ І ЎПАРТАСЬЦІ...

Словы чырвонага камандзіра з прагай праглыналіся комсамольцамі, бурай калыхалі глыбокую цішыню пляцку.

Гадзін у 11 ночы, рознаколерныя вайсковыя часткі, з рознымі клумачкамі за плячыма: тут і торба, аўстрыйскі ранец, нямецкі мех, простая саламяная карзінка накрыжпримацованая вяровачкамі да сьпіны і інш., крануліся ў паход.

Ішлі па сыпучых пясках Менскага тракту. Коўзаліся ногі і адплывалі назад, як адплываюць, калі ідзеш супроць шпаркай плыні ў рацэ, у паветры павісьлі ад пылу белыя хмары, але ішлі з песьнямі, з жартамі, нават і ня думаючы аб стоме.

У прытуленых да пясчаных берагоў жартаўлівай Бярэзіны вёсках КРЫВЫЯ КРУКІ, ЛУКІ, НАЗАРАЎКА І ШЧАТКАВА загадзя былі „запісаны кватэры“, дзякуючы чаму комсамольцы, прышоўшы на месца, адразу-ж разышліся па хатах і пунях.

Саставіўшы вінтоўкі ў козлы і вызваліўшы плечы ад клумкаў, дзе былі харчы на тры дні і іншыя паходныя рэчы, хацелася ўпоцемку дзяліцца ўражаньнямі, з таварышамі, пасьмяяцца з „сьлюнцяйства“ некаторых комсамольцаў, але было загадана спаць, бо заўтра раненька пад'ём.

Уклаўшыся на пацёртай саломе ці яловых трэсках, хлопцы ўсё-ж украдкаю перашэптваліся: „НУ ЯК, ЗМАРЫЎСЯ?“—„ШТО ТЫ. МАЛАДАЯ СІЛА — ГЭТА СТАЛЬ УРАЛЬСКАЯ І ЎТАМЛЯЦЦА СОРАМНА“.

ГАРОШЫН.

Што далі манэўры

Комсамольскія манэўры—гульня, ў якіх прынялі ўдзел комсамольцы Бабруйскай раённай гарадзкой організацыі і Бабруйскай раённай вясковай, прашлі з нечаканым уздымам.



Як трэба страляць

Кожны комсамолец у пачатку організацыі гэтага мерапрыемства добра ведаў, што гульня-манэўры — гэта **праверка дысцыплінаванасьці, праверка адданасьці і зацікаўленасьці організацыяй, праверка сваёй моцы, вытрыманасьці і посьпехаў у вайсковай вучобе.**

Перад кожным сябрам організацыі паўстала пытаньне: **комсамолец я, ці не? Раз комсамолец—пакажы сябе на манэўрах.**

І ўсе комсамольцы ахвотна рыхтаваліся да паходу, зьбіралі розныя вайсковыя мяшкі, патранташы, стрэльбы, шылі чахлы для біклажак, вясковыя хлопцы запасаліся лішняй парай лапцей і г. д., бо ведалі, што праходзяць праверку.

Былі, праўда, і такія, што стараліся ўвільнуць ад манэўраў. Напрыклад, нехта **Рубінаў** некалькі разоў прыходзіў у акругком і да ўрача і даказваў, што «**няда́ўна прыехаў з Ленінграду і ня прывык яшчэ да клімату Беларусі**“. Другія даказвалі, што «жонка цяжарная, з прычыны чаго нельга ісьці» і інш.

Можна сьмела сказаць, што праведзеныя манэўры **далі двум тысячам комсамольцаў гор. Бабруйску і Бабруйскага раёну поўнае разуменьне аб пабудове нашай Чырвонай арміі, задач узмацненьня абароны краіны і што яны зьявяцца штурхачом у палепшаньні працы вайсковых гурткоў і ячэек ТСААвіахіму.**

Заборцаў Ігнат.

Песьні, радасьць і вясельле

Комсамольцы Бабруйску ўмеюць добра працаваць. Гэта яны першымі ў Беларусі правялі **акомсамольваньне гармоніку**, гэта яны наладзілі **масавую паездку рабоча-сялянскай моладзі на падшэфны лінкор „Парыская Камуна“**, гэта яны правялі зараз **комсамольскі збор-манэўры** і рыхтуюцца да **паездкі па Бярэзіне усёй комсамоліяй гораду ў Парычы для ўзмацненьня сувязі з вясковымі комсамольцамі.**

Умеюць працаваць, умеюць і весяліцца.

У часе манэўраў, пасьля полудню, ці на прывале, разгараецца маладая кроў.

Вясёлая кампанія. **Дзьве тысячы комсамольцаў!** Колькі сярод іх добрых музыкаў, сьпявуноў, гульцоў, шутоў, вясельчакоў?!

... Толькі што былі на занятках, **бачылі быццам суровасьць камандзіра, даносілі начальству у выцяжку, ня хныкалі, гаварылі рапарты,** а заіграў гармонік полячку, пачаў уторыць яму бубен і **камандзіры і радасныя чырвонаармейцы - комсамольцы--найлепшыя сябры:** жартуюць, сьмяюцца, скачуць.

Словы ваяцкіх, комсамольскіх і народных песень задорыста вырываюцца з маладых грудзей і рэхам адгукаюцца на водах люстранай Бярэзіны.

Усеўшыся колам на зялёнай мураве дзяўчаты вядуць гутарку пра манэўры. Чарнамазая комсамолка з сьмехам па вуснах апавядае, як яны баяліся праспаць трывогу і як адзін камандзір Р. Г. паведамляў комсамолку **Гарэлік С.** з акруда аб часе манэўраў. Камандзіры, што сядзяць каля дзяўчат, упіваюцца і незгаджаюцца: **даказваюць сваю адданасьць вайсковым сакрэтам.**

...У нядзелю вечарам у Луках быў вялікі культурна-масавы вечар. Прыехала з Бабруйску сіняя блюза. Мо' у першыню сабралася стараверская моладзь на такі вечар. Бацькі яе—старавeры—не задаволены «новым» і трымаюць дзяцей у цісках. Але вальсы і беларускае напуры духавога аркестру саблазьнілі нават і дзядоў з шырокімі, як лапата, барадамі. І яны прышлі паслухаць.

У вёсцы Назараўка, на беразе Бярэзіны, першы батальён наладзіў вечар самадзейнасьці. Сабралася шмат вольнай публікі.

Зося Галавач.



Першая дапамога параненаму

Дзень радасных заняткаў

Назаўтра, у нядзелю, а сёмай гадзіне раніцы быў пад'ём. Амаль ніхто ня скардзіўся на малы час сну (некаторыя батальёны прышлі ў вёскі гадзіны ў 2 ночы) і праз хвілін 10 усё былі ў поўным зборы. Праверка, вызначылі дняватльных вартаваць рэчы і роты пасьняшлі ва вёскі на заняткі.

Вайсковыя заняткі і падрыхтоўка да бою занялі цэлы дзень напружанай працы. У гэты дзень комсамольцы, удзельнікі манэўраў, дасканала пазнаёміліся (і паўтарылі свае ранейшыя веды) **з вінтоўкай, строем, тэхнікай руху вайсковых частак, атрымалі пачатковае**



У полі на занятках

разуменьне аб разьведцы, і больш падрабязгова азнаёміліся з наступленьнем арміі і абаронай.

Заняткі даволі цяжкія. Напрыклад, прышлося некаторым ротам прапаўзьці адлегласьць гоняй на пяць. Бяз прывычкі гэта надзвычайна цяжка, а тут яшчэ вінтоўка ў руках ды клумак заплячыма.

Але комсамольцы скардзіцца нават і ня думалі. Яны добра ведаюць, што лёгка нішто недаецца. Наадварот, усе загады па навучаньню выконвалі зараз-жа, бяз усякіх ад неквавьняў, а дзяўчаты-санітаркі, прашоўшыя ў Бабруйску санітарныя курсы, **нават скардзіліся, што ім мала працы і жадалі нараўне з хлопцамі з вінтоўкаю ў руках займацца строем.** Таксама неахвотна, бязумоўна не паказваючы гэтага камандзірам, пакідалі комсамольцы заняткі і ішлі з даносам у другі батальён ці роту.

* *

Вёскі **Крывыя Крукі, Лукі, Назараўка, Шчаткава** ніколі ня бачылі на сваіх пясчаных, вечна незасеяных палёх, такіх жывых малюнкаў. Выганы для жывёлы, узгоркі, папар былі ўсланы стройнымі кучкамі комсамольцаў. За некалькі вёрст можна было бачыць, як бляск штыкоў мількаў у паветры, або калыхаўся батальён пераходзячы на новае месца.

Нельга не адзначыць таго радаснага факту, што комсамольцы—актывісты, у сваёй большасьці, былі прыкладам для радавых комсамольцаў.

Напрыклад, **Рубінчык**—загадчык АПА Бабруйскага гарадзкога райкамолу—ротны політрук па манэўрах—і ў часе паходу і на занятках проста дзівіў усіх сваёй вытрыманасьцю, сур'ёзнасьцю і адданасьцю справе.

Сакратар комсамольскай ячэйкі шкляного заводу «Комінтэрн» тав. **Гарбачоў** сам усе заданьні сумленна выконваў, сачыў за іншымі і ахвотна дапамагаў слабейшым комсамольцам.

І многа іншых таварышоў-актывістых сваім прыкладным трыманьнем запальвалі комсамольцаў жаданьнем чым найбольш атрымаць вайсковых ведаў...

Ішлі з заняткаў на «кватэры» з песьнямі, бадзёрыя, як і раніцою.

Кліванскі Мікола.



Разьведка

Комсамол--рэзэрв Чырвонай арміі

Пасьля сканчэньня комсамольскіх манэўраў, наш спэцыяльны корэспондэнт меў гутарку з камандным і політычным складам збору. Вось што яны кажуць аб вайсковай падрыхтоўцы комсамольскай організацыі.

Тав. Пліанскоўскі
(Начальнік штабу комсамольскага збору).

— У агульнай сваёй масе комсамольцы досыць падрыхтаваны да ўспрыйманьня вайсковых ведаў.

Камандзіры не паведамілі **ніводнага выпадку непаслушэнства з боку комсамольцаў.** Наадварот, **усякія загады, нават самыя цяжкія, выконваліся бяз усякіх спрэчак.**

Нельга не адзначыць вялікай адданасьці справе з боку **комсамольцаў—вэлёсыпэдыстых.** Яны надавычайна сумленна выконвалі свае абавязкі на сувязі, давалі машыны іншым таварышам і не падымалі бучы, калі здараліся якія небудзь паломкі.

Тав. Філіпаў
(Начальнік опэрацыйнай часткі, сакратар Акруговага ТСААвіахіму)

Адзначыўшы даволі добрую падрыхтоўку з боку акругкому комсамолу і сваечасовую разьбіўку комсамольцаў па вайсковыя часткі, тав. Філіпаў зазначыў:

— У далейшым неабходна **такія паходы практыкаваць комсамольскім організацыям часьцей.** Яны зьявяцца закалкай маладых організмаў, дадуць асноўныя знаёмствы нашаму маладняку з пабудовай Чырвонай арміі, палепшаць працу комсамольскіх вайсковых гурткоў і ячэек ТСААвіахіму. У справе ваенізацыі мас Бабруйшчыны, **праведзеныя манэўры адыграюць вялікую ролю.**

Была вайна, але бяз крыві.

У панядзелак быў пад'ём у 4-ры гадзіны раніцы. Мігам, па баявому, сабраліся і крануліся у паход.

Асобны батальён--**сінія**--маскіруючыся за ўзгоркамі, займае пазіцыі абароны прыступаў да гораду Бабруйску.

Комсамольскі стралковы полк--**чырвоныя абаронцы працоўных, з чырвонымі аколышкамі, або лентачкамі на шапках**—паўкругам заходзіць з тылу сасновага бору, каб адтуль выглядзець сілы ворага, нанесьці яму раптоўны ўдар і прымусіць згублена ўцякаць.

Каля лесу вялікая пясчаная пустэча з выкрутастымі жоўтымі межкамі, што засталіся ад нямецкіх акопаў.

З боку гэтай незасеянай плошчы, на ўзгорку ўвабраным гарбатымі сасонкамі разьмясьціўся **дазорны пункт і галоўны штаб кіраўніцтва.** У старой разбуранай зямлянцы брачаць тэлефонныя званкі, і час ад часу глуха чутны выкрыкі ўмоўных знакаў вопытным тэлефаністым: Менск! Менск!, або: Слуцак! Слуцак! За кожным рухам тэлефаніста прагавіта сочаць комсамолкі--тэлефоністкі гатовыя хоць зараз цішком паўзьці да лініі ворага і аглядаць спраўнасьць тэлефонных правадоў.

На вышэйшай балцы тэрыторыі занятай сінімі (асобным батальёнам) пачалі рухацца бяз усякага прыкрыцьця чалавечыя фігуры. Начальнік штаба кіраўніцтва тав. **Пліанскоўскі** агляну́ўшы напрактыкаваным вокам праз бінокаль пазіцыі ворага пачынае хваляваццa:--**лазяць без усялякай маскіроўкі. Гэта нікуды нява́рта.**

Наглядаць за ходам бойкі прыехаў і тав. **Акуліч.** Яму тав. **Філіпаў,** начальнік опэрацыйнай часткі, далажыў аб занятасьці сваіх пазіцый, як сінімі, так і чырвонымі.

З абодвых бакоў, зайчыкамі перабягаючы з кусьціка да кусьціка, вожыкам перапоўзаючы з межкі у канаву, пацягнуліся разьведкі, пакідаючы ззаду сябе адметкі, якія гавораць аб адсутнасьці небясьпекі.

Заўважыў гэта тав. **Акуліч** і параіў «захапіць ураплох» разьведку чырвоных. Перапужаліся хлопцы, але калі камандзір комсамольскага збору пачаў экзамінаваць разьведчыкаў аб іх разьведачнай адукацыі, пасьмяялі ваякі, а усё-ж падымацца з канавак ня хочуць. Даўшы некаторыя указаньні разьведчыкам у іх далейшай дзейнасьці, тав. Акуліч едзе далей па фронце.



У часе бою

Прыблізна ў поўдзень, калі баявыя пазіцыі былі заняты, з дазорнага пункту вогненымі стрэламі паляцелі ракеты. Бойка пачалася.

Адны ўзводы вядуць сярэдні агонь. Другія прыгнуўшыся да зямлі перабягаюць упярод і займаюць новыя пазыцыі.

Санітаркі разбуранымі акопамі тулячыся ад куляў ворага падбіраюць раненых.

Падносчык патронаў Яшка з першай стралковай роты першага батальёну з выразам вялікай адказнасьці на твары за выконваемыя абавязкі старанна бегае па пазыцыі свайго узводу.

Правы фланг пасьля некатарага націску пусьціўся у контр'атаку. Узмацнёны агонь, больш старанне падцягваньне тылавых частак і пад выкрыкі «ура» чырвоныя атакавалі сініх.

Яшчэ сям-там чутны адзінокія глухія выстралы, загады камандзіраў, а некалькі чырвоных кавалярыстых разразаючы паветра шашкамі праскакалі поле бойкі і на занятай тэрыторыі паднялі пераможны сьцяг.

Адбой...

Аддзяленьні зьбіраюцца ва узводы. Узводы ў роты, роты злучыліся ў батальёны, а апошнія правёўшы невялічкія сходы-падагульненьні на колькі справіліся з задачамі—адной маналітнай калёнай пашлі ў горад.

Ішлі комсамольцы па бруку вуліц, рытмічна выстуквалі нагамі інтэрвалы крокаў, зацягвалі песьні ваяцкія, а на загарэлых тварах радасьцю сьвяціліся вочкі.

Глядзіш на гэту моцную сям'ю, на адданасьць сяброў агульнай справе, на тую завісьць у пабочнай публікі, якую выклікала стройная ваяцкая паходка з вінтоўкай за плячыма комсамолкі **Пігулеўскай Веры,** і самі словы напрашваюцца:

— **Мы магутны, мы непераможны.**

Зьм. Паваротны.

У Аршанскім Акругкоме ЛКСМБ

Аршанскі АК ЛКСМБ арганізуе **акруговыя курсы прапагандыстаў.** Тэрмін занаткаў на курсах вызначан з 1-га жніўня па 1-е верасьня.

Задача курсаў—падрыхтоўка выкладчыкаў і кіраўнікоў гурткоў 2-й катэгорыі і выкладчыкаў грамадазнаўства ў ВШСМ.

Курсамі будзе ахоплена 50 асоб.

У верасьні месяцы акругком праводзіць раённыя курсы актыву. Мэта курсаў—падрыхтаваць кіраўніка вясковага політгуртка першай катэгорыі і часткова другой.

Новы каштарыс галоўполітасьветы БССР.

Народным Камісарыятам Асьветы БССР зацьверджан каштарыс Галоўполітасьветы на 1927-28 год.

Пановаму каштарысу выдаткі на політасьвеце будучага году ня будуць правышаць выдаткаў 1926-27 г. Сетка хат-чытальняў павялічана ня будзе.

За лік сродкаў, адпушчаных урадам БССР на будаўніцтва новых клюбаў, пабудаваных ужо ў мінулым годзе, намячаецца павялічэньне пунктаў па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці на 50 проц.

Па каштарысу адпушчаецца субсыдыя ў 4500 руб. на арганізацыю Цэнтральнага Экскурсійнага Бюро. Да гэтай справы прыцягваецца культаддзел ЦСПСБ.

Таксама ў каштарысе прадугледжваецца ўтрыманьне польскага перасовачнага тэатру і яўрэйскага хору. Трымаецца курс на рэарганізацыю студыйнага Беларускага хору ў дзяржаўную Беларускую капэлу. У каштарыс унесена субсыдыя на 50 новых кіно-перасовак.

Наркамасьветы хадайнічае аб водпуску грошай на скліканьне 1-га Ўсебеларускага Зьезду бібліятэчных і клюбных працаўнікоў.

Вялікую ўвагу ўдзяляе каштарыс асьвеце рабоча-сялянскай моладзі і юнацкай літаратурнай творчасьці. У гэтым годзе ў Менску адчыняецца вячэрні рабочы Унівэрсітэт, разьлічаны на 120 чалавек, намячаецца скліканьне зьезду працаўнікоў вячэрніх школ сялянскай моладзі. Высоўваецца пытаньне аб утрыманьні фэдэрацыі літаратурных аб'яднаньняў „Узвышша" і ўсіх філіяў „Маладняку".

У „тыдзень абароны"

60 сходаў, прысьвечаных „тыдню"

За першыя 4 дні „тыдню абароны" па Менску праведзена каля 60 сходаў рабочых і служачых, прысьвечаных „тыдню абароны".

На ўсіх сходах прыняты пастановы аб адлічэньнях у фонд „Наш адказ Чэмбэрлену". Устрайваюцца стралковыя ціры вызначаюцца сродкі на закупку вінтовак для вайсковых гурткоў.

Яшчэ 901 р. 87 к.

Кружачны збор у фонд „Наш адказ Чэмбэрлену" за першыя толькі 1½ дні „тыдню абароны" даў па Менску 541 руб. 87 кап.

Ад лётарэі на гэтую-ж мэту выручана 360 руб.

Спаборніцтвы вэлёсыпэдыстых

16-га ліпеня, а 6-ай гадзіне ўвечары ў садзе „Профінтэрн" будуць праведзены спаборніцтвы вэлёсыпэдыстых на хутчэйшую дастаўку данясеньня да чырвонаармейскіх лягераў, знаходзячыхся ў адлегласьці 7 вёрст ад саду.

У спаборніцтвах могуць прымаць удзел усе жадаючыя.

Лепшым вэлёсыпэдыстым будуць выдадзены прызы.

Цэлы год выплачваюць

„Лепей позна, чым ніколі»—сказалі сяляне, працуючыя ў Рудзенскім жалезкоме, прышоўшыя за атрыманьнем грошай у кантору.

«Лепей пазьней, тады будзе ніколі», —думаў сабе кіраўнік Рудзенскага жалезкому і калі сяляне прышлі ў кантору за грашыма, ён ім сказаў, што грошай цяпер няма:

— Прыдзецца пачакаць.

Пацяклі дні. Пачаліся палявыя работы. Сяляне добра захавалі квіткі, па якім прыдзецца атрымоўваць грошы.

І толькі прашла гарачая пара палявых работ, прышлі яны ў жалезком за грашыма.

З раніцы чакалі, покуль урэшце да іх не «соблагоизволил снизойти» кіраўнік жалезкому.

Узяшўшы квіткі, абгледзеў іх уважліва, некалькі раз перавярнуў... нават панюхаў... і потым рашучай паходкай падышоўшы да свайго стала, узяў вялізны аловак і размашыстым почаркам накаціў:

«Тэрмін сьцёк, разьлік ня можа ўжо быць утворан.»

Колькі сяляне яму ня тлумачылі, крычалі:

— За што-ж мы працавалі?

Кіраўнік Рудзенскага жалезкому быў цьвёрды, як камень.

Прамычаўшы нешта незразумелае, ён кудысьці пабег і прымусіў сялян ні з чым паехаць назад у вёску.

Кіраўнік жалезкому рад.

Лёзунг яго: «Лепей пазьней, тады будзе ніколі»—перамог.

Але ня тут-та была. Даведаўшыся пра бюро скаргаў, якое існуе пры РСІ, сяляне напісалі туды скаргу.

Бюро скаргаў катэгорычна прапанавала выплаціць грошы сялянам. Акрамя таго паслана хадайніцтва ў кіраўніцтва Заходніх чыгунак аб прыцягненьні кіраўніка Рудзенскага жалезкому да адказнасьці.

Але-ж падумайце толькі: уся гэтая гісторыя ўжо цягнецца больш году!

Свой.

„Хто-ж будзе шчасьліўцам?"

(На розыгрышы ўсебеларускай лётарэі на карысьць бяспрытульных)

Мары аб пяці тысячах

— Янка, ты што, 5000 жадаеш выграць?

— Але... Ня менш.

— Ну, браток, гэты нумар ня пройдзе. Яны за мной. Мне-ж патрэбна кватэра, парткі і добры гальштук, да гэтага.

Такая тэма, прыблізна ўсіх размоў, у саду Працасьветы 11-13 ліпеня. Кожны чамусьці лічыць, што на яго нумар абавязкова павінна пасьці 5000.

У другой групе нейкая жанчына ўжо разьмяркоўвае як яна выкарыстае свой выйгрыш.

— 500 рублёў ахвярую на бяспрытульных, 500—на фонд абароны. На астатнія добра апрану сябе і сям'ю і паеду ў Крым—покуль хопіць грошай...

Тым часам зьзьвінеў званок, сябры тыражнай камісіі занялі свае месцы і вочы ўсіх памкнуліся на сцэну. Зараз адчыняецца розыгрыш.

На пярэднім пляне стаіць 6 урнаў—іх прызначэньня пакуль яшчэ ніхто ня ведае.

Пасьля тлумачэньня аб тым, як будзе праходзіць тыраж і розыгрыш, лётарэя пачынаецца.

Першы нумар

Першы нумар, які абвяшчае тыражная камісія—нумар 337,063. І як толькі на вялізнай чорнай дошцы выбудавалася апошняя цыфра, сярод публікі пранесься гул. На задніх шэрагах зараз-жа адшукаўся шчасьлівы ўладар шчасьлівага нумару і многія з публікі лічаць патрэбным абглядзець выйграўшую абліґацыю і параўнаць яе з сваёй, а нумар з лічбай, якая стаіць на дошцы.

За першым нумарам хутка ідуць другія «шчасьлівыя». Тыражная камісія прапушчае ў хвіліну па 5 нумароў.

Як нараджаюцца нумары выйгрышаў.

Мэханіка працы розыгрышу даволі складаная. Для таго, каб скласьці нумар выйграўшага білету, трэба шмат чаго зрабіць. Мы ўжо вышэй напісалі, што на сцэне стаіць 6 урнаў. У кожнай урне знаходзяцца цыфры ад нулю да дзевяці. Ля урнаў—6 піонэраў. Нумар складаецца наступным парадкам:

Піонэр, які стаіць ля першай урны, выцягвае адзін нумар (напрыклад, 2)—тады старшыня тыражнай камісіі запісвае ў сябе гэты нумар. За першым піонэрам цягнуць другія. І калі, напрыклад, другі піонэр выцягнуў цыфру—4, трэці—1, чацьвёрты 0, пяты--1 і шосты--3, гэта значыць, што з іх атрымліваецца выйгрышны нумар--241,013.

Тыраж ідзе... усё хутчэй і хутчэй пачынаюць выклікацца нумары. Гэта значыць, што і сябры тыражнай камісіі і піонэры атраду Саўнаркому набылі ўжо некаторую «кваліфікацыю» ў гэтай справе.

Ужо некалькі раз з публікі падымаліся шчасьліўцы, якія выйгралі па 5 руб.

Вось толькі што выклікнулі нумар і падняўся той самы хлапец, які спадзяваўся выйграць 5000.

— Вось кепска... на адзін білет выіграў толькі 5 рублёў. Прапалі мае 5000. Ні кватэры, ні парткоў, хіба толькі гальштук куплю...

Тыражная камісія абвяшчае перапынак на 5 хвілін. На сцэну зьяўляецца нейкі грамадзянін, які рэкомэндуе сабе савецкім служачым і паказвае тыражнай камісіі 75 купленых ім білетаў...

— Гэта ўсё каштуе каля 18 рублёў, —гаворыць ён,—а пакуль ніводнага выйгрышу... Ці-ж ня сорамна вам.

Я ня ведаю ці «засаромілася» тыражная камісія, ці «білетнага капіталістага» пасьціг добры лёс, толькі на другі дзень ён ужо паказаў мне 2 білеты, якія выйгралі па 5 руб.

А ўсе-ж такі ў агульным публіка не здаволена. Сярод прысутных так мала на першы погляд выйграўшых.

— Так і ведаў, што нічога ня выіграю... Добра толькі, што пойдуць мае кроўныя грошы хаця-б на бяспрытульных,—гаворыць бадай кожны.

Галоўны выйгрыш—5000 чакаецца сёньня. І зараз кожнага цікавіць пытаньне:

— Хто-ж будзе шчасьліўцам?

Мік. Таў.



Першы атрад юных піонэраў Саюзу будаўнікоў (Гарадзкі раён) уносіць на пабудову „Крыла Піонэра" ў самалёце „Наш адказ Чэмбэрлену" тры рублі і выклікае атрады: Працасьветы, Працмастацтва, заводу дрэваапрацоўшчыкаў, 2, 3, 4, 5 і 6 атрады будаўнікоў гарадзкога раёну.

Ячэйка ЛКСМБ працасьветы Аршанскай гарорганізацыі ўносіць у фонд „Наш адказ Чэмбэрлену" сабраныя па падпіснаму лісту 3 руб. 21 кап. і выклікае пасьледаваць яе прыкладу яч. Працасьветы Менску, Магілеву і Бабруйску.

Усебеларускія курсы ліквідатараў няпісьменасьці

На гэтых днёх адчыніліся Ўсебеларускія курсы ліквідатараў няпісьменасьці, ставячыя сабе мэтай падрыхтаваць кіраўнікоў раённых лікпунктаў.

На курсы зьехалася 33 чалавекі.

Курсы працягнуцца 1½ месяцы.

Перападрыхтоўка ізбачоў

Дзеля перападрыхтоўкі загадчыкаў хат-чытальняў склікаваны паўтарамесячныя Ўсебеларускія курсы ізбачоў.

На курсах займаецца 100 чалавек.

Крывое люстра

Знаёмства з „жыцьцём".

Кожны чалавек разьвіваецца наступова. Спачатку, калі яму ўсяго 10-12 год, ён цікавіцца гульнямі, працай сваёй школы ці піонэратраду, цікавіцца вучобай і шмат чым іншым—дзіцячым. Але чалавек расьце, і чым больш яму становіцца гадоў, тым больш рэчаў, якія яго цікавяць, тём больш ён стараецца пашырыць свой кругавід.

Быў час, калі комсамолец Віцебскай ячэйкі друкароў Жыткевіч і яго таварыш-беспартыйны Навіцкі таксама цікавіліся гульнямі і вучобай, быў (зусім нядаўна) час, калі іх цікавіла грамадзкая праца, комсамол і шмат іншага—юнацкага. Нярэдка яны сумесна разьяжджалі па вёсках і раённых цэнтрах Віцебскай акругі, бывалі на конкурсах гарманістых і балалаечнікаў, адным словам, таварышы былі добрыя. Навіцкі добра іграў на цымбалах, а Жыткевіч аб гэтым пісаў у газэты.

Але, чалавек расьце і яго кругавід шырыцца. Жыткевіч і Навіцкі таксама расьлі, і яны таксама жадалі шырыць свой кругавід.

Парашылі пачаць азнаёмлівацца з „жыцьцём", каб адведаць усё яго сладасьці...

* * *

Як і заўсёды прывычна, адзін раз, зазьвінеў тэлефон у раённай міліцыі гор. Віцебску і дзяжурны міліцыянэр пачуў узбураны мужчынскі голас:

— Хутчэй вышліце міліцыянэра! Па Гогалеўскай вуліцы, будынак № . . . у кватэры В. п'яныя госьці ўчынілі дэбош...

Праз некаторы час міліцыянэр прыбыў на месца. Але не пасьпеў яшчэ адчыніць дзьверы, як ад моцнага штуршка паляцеў з драбіны. На дапамогу прыбыў яшчэ адзін, але куды там—ім не ўдалося перашкодзіць Жыткевічу і Навіцкаму знаёміцца з жыцьцём.

П'яных сяброў супакоіць змог толькі цэлы нарад міліцыі і арыштанцкі пакойчык у міліцэйскім будынку.

* * *

Цяпер аб гэтым і Жыткевіч і яго таварыш, здаецца, аб усім забыліся, як аб гэтым забыліся і тыя арганізацыі, якія зьбіраліся „нагрэць" таварышоў за іх учынкі.

Аб Навіцкім нам мэнт за ўсё пісаць--ён беспартыйны. Аб ім павінны паклапаціцца другія арганізацыі.

А што датычыцца да Жыткевіча, скажам:

— Знаемства з жыцьцём—рэч някепская, але пазнаеміць комсамольца з некаторымі відамі сьюзных узысканьняў таксама не перашкаджае.

Нін. Ак-скі.

Адказы чытачам

Краснаму (№ 1015). Аслабаняюцца ад іспытаў пры паступленьні ў тэхнікум толькі скончыўшыя сямігодкі, маючыя водгук пэдсавету. Аб тым ці прынят ты, можна спічацца з праўленьнем тэхнікуму.

Яму-ж (№ 1016). Адрас Яўрэйскага Пэдагогічнага Тэхнікуму—Менск, Неміга-Ракаўская, д. № 9.

Х. У. (№ 1017). Калі маеш атэстат аб сканчэньні школы, трэба яго прадставіць ў тую навучальную установу, у якую ты паступаеш.

Яму-ж (№ 1018). Пры кожнай навучальнай установе, ў пэрыод экзамінаў студэнцкімі организацыямі організуюцца камісіі для аказаньня дапамогі паступаючым. У гэтую камісію і патрэбна зьвярнуцца для атрыманьня месца ў інтэрнаце.

Паступаючаму (№ 1019). Адрас факультэту Права і Гаспадаркі БДУ: Менск, Земляробчы перавулак, у дэканат факультэту Права і Гаспадаркі.

Х. № (1020). Іспыты паступаючых ў тэхнікумы, пачнуцца 15 жніўня.

Яму-ж (№ 1021). Па растлумачэньню Галоўпрафасьветы, скончыўшыя агульна-адукацыйныя курсы ў 1926-27 навуч. годзе, прымаюцца ў тэхнікумы БССР без іспытаў.

Яму-ж (№ 1022). У Менскую Профшколу краўцоў прымаюць з ведамі сямігодкі.

Абрамовічу (№ 1023). Мастацкі тэхнікум знаходзіцца ў Віцебску. Пішы па адрасу: Віцебск, у Мастацкі тэхнікум.

Вішкоўскаму (№ 1024) Прыём у профшколу будаўнікоў будзе. Прымаюць з ведамі сямігодкі.—Іспыты адбудуцца ў жніўні м-цы.

Бярнштэйну (№ 1025). Акрамя музычных спэцыяльных дысцыплін у Музтэхнікуме праходзяць яшчэ і агульна-адукацыйныя дысцыпліны. Па сканчэньні тэхнікуму, можна атрымаць веды ў аб'ёме сярэдняй школы.

Савіцкай (№ 1026). Набэр у школы сялянскай моладзі адбудзецца ў жніўні і верасьні м-цы. Для паступленьня трэба мець веды 4-годкі.

Мазырскаму (№ 1027). АК ЛКСМБ можа не дазволіць комсамольцу пераехаць вучыцца.

Яму-ж (№ 1028) Пры паступленьні ў ВНУ можна пасылаць копіі, але трэба, каб яны былі завераны належнай установай.

Яму-ж (№ 1029) АК ЛКСМБ мае права не дазволіць комсамольцу пераехаць у другі горад.

Абязгаузу (№ 1030) Прыёму заяў ў Віцебскі Электра-Мэханічны тэхнікум спыніцца 15 жніўня.

Яму-ж (№ 1033). Трэба зьвярнуцца ў сямігодку якую ты скончыў, там замест згубленага пасьведчаньня аб сканчэньні сямігодкі атрымаеш другое.

Сем год у чаканьні кары

Труп ля паліцэйскага дому

У Амэрыцы вельмі многа эміграптаў-бежанцаў з другіх краін. Перабраўшыся ў шуканьнях лепшага жыцьця і папаўшы замест чаканага „раю" ва ўмовы жорсткай эксплёатацыі, яны асабліва хутка робяцца прыхільнікамі рэволюцыі.



Т. т. Сакко і Ванцэцьці.

Да лічбы эмігрантаў-рэволюцыянэраў належаў італьянскі рабочы-друкар Сальсэдо. Вядома, паліцыя не пакінула яго ў супакоі. Сальсэдо быў арыштаваны. Некаторы час аб ім ня было ніякіх чутак. Праз некалькі дзён, на адной з вуліц Нью-Ёрку, ля сьцяны чатырохпавярховага дому, у якім зьмяшчалася аддзяленьне паліцыі, знайшлі цела забітага на сьмерць чалавека. У трупе апазналі Сальсэдо...

Сальсэдо забіла паліцыя

Як папаў труп на вуліцу к сьцяне паліцэйскага дому?

Пачалі рабіць дагадкі. Многім у галаву прышла адна і тая-ж думка: „яго забіла паліцыя".

З штату Масачузэтс прыехалі двое рабочых, таварышы Сальсэдо-Сакко і Ванцэцьці. Яны рашылі расьсьледваць абставіны таемнай сьмерці.

Яшчэ да іх прыезду было вядома, што Сальсэдо падпаў пад жорсткія зьдзекі і катаваньні паліцыі. Гэтыя факты расьсьледваньне Сакко і Ванцэцьці пацьвердзіла. Стала зусім ясна, што забойцаю Сальсэдо зьяўляецца паліцыя.

Мала таго. Сакко і Ванцэцьці набылі матар'ялы і дакуманты, улічаючыя ў цёмных злачынных дзеяньнях самае міністэрства юстыцыі Злучаных Штатаў.

Гэта было ў 1919 годзе.

Сакко і Ванцэцьці арыштоўваюцца

Урад, вядома, ня мог прасьціць гэтых выкрыцьцяў. У хуткім часе, у 1920 годзе, Сакко і Ванцэцьці арыштоўваюцца. Ім прад'яўляецца абвінавачваньне ў крымінальным злачынстве—у замаху на рабунак і забойства.

Абвінавачваньне, бязумоўна, ліпавае. Але „праведны" суд ідзе далей З дапамогай лжэсьведак, ды і то з грэхом папалам, абвінавачваньне „даказваецца". Прыгавор—сьмерць на электрычным стуле.

Усе сьвядомыя рабочыя з абурэньнем спаткалі гэты прыгавор. Адусюль панесьліся тэлеграмы протэсту, якія патрабавалі перагледзець справу. Выкананьне прыгавору прышлося адкласьці.

Быў угвораны спэцыяльны рабочы камітэт дзеля раскладваньня справы. Адразу-ж высьвятлілася, што абвінавачваньне супроць Сакко і Ванцэцьці—выдумка.

„Яны не вінаваты!".

Шэраг сьведак, выступаўшых супроць іх, адмовіліся ад сваіх хлусьлівых паказаньняў і сазналіся, што яны гэта рабілі пад націскам. Нядаўна да судзьдзі штату Масачузэтс зьявіўся чалавек і заявіў, што злачынства, ускладзенае на Сакко і Ванцэцьці, зроблена ім.

Нявіноўнасьць двух рэволюцыйных рабочых выплывае досыць яскрава, але судзьдзі не сьпяшаюцца перагледзець справу.

Ім пагражае сьмерць.

З тых часоў прашло ўжо 7 гадоў. Судзьдзі ўсё чакаюць. Зусім нядаўна губарнатару штату Масачузэтс пададзена прашэньне аб пераглядзе справы і вызваленьні нявіноўных. Пад прашэньнем стаяла паўмільёну подпісаў. Але і на гэту заяву судзьдзі не зьвярнулі ўвагі.

Зараз кара набліжаецца. Аб'яўлена, што 10-га жніўня Сакко і Ванцэцьці будуць пакараны на электрычным стуле. Яны ўжо пераведзены з агульнай турмы ў камеру для сьмертнікаў пры турме штату Масачузэтс. Пры гэтай турме знаходзіцца электрычны стул дзеля ўчынку караў над асуджанымі. Калі губарнатар ізноў не адстрочыць кары, 10 жніўня два рабочых-рэволюцыянэры будуць забіты амэрыканскім „правосудцем".

Вечар „Чырвонай Зьмены".

17-га ліпеня (нядзеля) рэдакцыяй газэты **„Чырвоная Зьмена"** і клюбам **„КІМ"** організуецца вечар, прысьвечаны пяцітыднёвіку **„Чырвонай Зьмены"**.

Програма вечару: дыскусія на тэму; «Ці павінен кожны комсамолец і кожны малады рабочы выпісваць і чытаць **„Чырвоную Зьмену"**, выступленьне маладнякоўцаў, сьветавая газэта і хор.

Білеты пасланы па Райкомам КСМ. На вечар таксама запрашаюцца наступныя т. т.: Кнорын, Ігнатоўскі, Акулік і Гершон (Менскі АК КПБ), Галавач і Ліўшыц (ЦК ЛКСМБ), Сянькевіч і Давідовіч (Аддзел Друку ЦК КПБ), Шульман («Звезда»), Шукевіч-Трацьцякоў («Бел. Вёска»), Трус (ЦБ Маладняка), Кудзелька, Зарэцкі і Каплан («Савецкая Беларусь»), Ашэровіч і Дунец («Октябрь»), Жылуновіч (Белдзяржвыдавецтва), Сольц («Юнгэр Арбэйтэр»), Бюро Менскага АК ЛКСМБ, Сакратары і Агітпропы ўсіх райкамолаў г. Менску.

Вечар адбудзецца ў садзе клюбу «КІМ». Пачатак а 9-й гадзіне ўвечары.

Рэдакцыя газ. „Чырвоная Зьмена"
Праўленьне клюбу „КІМ".

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.